*Людміла СМАГІНА,*
*старшы навуковы супрацоўнік БелНДІ адукацыі, кандыдат педагагічных навук,*
*Віктар ЧЭЧАТ,*
*загадчык аддзялення праблем выхавання БелНДІ, кандыдат педагагічных навук*

# МІЛАСЭРНАСЦЬ У БЕЛАРУСКІХ СЕМ'ЯХ

Даўно заўважана, што кожны народ мае свае характэрныя рысы, свой твар. Вывучаючы гісторыю, этнаграфію і фальклор Беларусі, многія даследчыкі (Я. Ф. Карскі, Н. Я. Нікіфароўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, І. І. Насовіч і інш.) адзначалі, што спрадвеку беларусам былі уласцівы працавітасць, беражлівасць, добрасумленнасць, паважлівасць, нейкая асаблівая чуласць, дабрыня ў адносінах да людзей, клапатлівасць аб старых і дзецях. Дзякуючы гэтым маральным якасцям, многія лепшыя агульначалавечыя каштоўнасці, традыцыі, нормы і звычкі вытрымалі выпрабаванне часам і працягваюць жыць сярод беларускага народа. Так, спрадвечнай маральнай нормай беларускіх жанчын было тое, што маці практычна ніколі, ні пры якіх абставінах не адмаўлялася ад свайго роднага дзіцяці. Калі ж такое здаралася, то жанчыну чакала ўсеагульнае асуджэнне, гнеў і праклёны.

У беларускага народа бытаваў і такі міласэрны звычай: калі дзеці заставаліся сіротамі, то іх бралі у свае сем'і родзічы. Родзічаў не аказвалася, выхоўвалі суседзі або чужыя людзі ў сваёй ці іншай вёсцы. Нездарма сярод беларускіх прыказак і прымавак, у якіх канцэнтруецца народная педагогіка, жывуць такія: "Не пасціся, не маліся, а дай прытулак сіраце", "За прытулак сіраце бог шчасце падае", "Чужое дзіця прыносіць шчасце ў хату".

Такія адносіны да гаротных дзяцей трымаліся ў звычаях беларусаў да апошніх дзесяцігоддзяў. І нават у самыя цяжкія часіны (войны, голад, разруха, рэпрэсіі і інш.), калі колькасць дзяцей-сірот узрастала, добрыя людзі праяўлялі аб іх клопат, не пакідалі без догляду. Але змяніўся час, змяніліся і адносіны паміж людзьмі. У 60-80-х гадах старэйшае і сярэдняе пакаленні беларусаў са здзіўленнем і жахам сталі сведкамі самай агіднай для чалавека з'явы — жорсткасці да безабаронных малых. "Мацяркі-зязюлі" і "бацькі-ўцекачы" пачалі не толькі пакідаць, а і выкідваць на вуліцу сваіх родных дзяцей. У 1992 годзе ў Рэспубліцы Беларусь дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, налічваецца звыш 20 тысяч — цэлы горад! Прычым каля 90% з іх з'яўляюцца сіротамі пры жывых (!) "бацьках". Штогод дамы дзіцяці рэспублікі прымаюць каля 800 немаўлят, пакінутых маці.

Становішча было б зусім нясцерпным, калі б побач з гэтымі, так званымі "людзьмі новага тыпу", не існавалі, як і раней, людзі з добрымі сэрцамі і чулымі адносінамі да кінутых дзяцей. Яны усынаўляюць, бяруць пад апеку, выхоўваюць разам са сваімі ў сем'ях. Прывяду такі факт. Дырэктар Дулебскай школы-сада Бярэзінскага раёна Мікалай Уладзіміравіч Грудзінскі разам са сваімі настаўнікамі, вучнямі і бацькамі узялі на выхаванне больш за 20 дзяцей-сірот. Пры школе для іх пабудаваны мікрарадом. А з 1989 года у рэспубліцы з'явіліся дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Гэта, на першы погляд, незвычайныя, а ўвогуле самыя звычайныя, міласэрныя сем'і. Маючы родных дзяцей, яны бяруць на выхаванне яшчэ пяцёра і больш прыёмных.

На сённяшні дзень у гарадах і вёсках Беларусі створана 18 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. У іх ліку сям'я Бушмакіных з Нясвіжа, Глухавых і Сінцовых з Бабруйска, Дзячковых з пасёлка Мірны Магілёўскай вобласці, Істыкулавых з Пружан, Карповічаў з вёскі Міколка Уздзенскага раёна, Кузняцовых, Кузьмянковых, Кулікоўскіх і Кур'яноў з Мінска, Кундзікавых з Клічава, Кутузавых і Мешчараковых з Гродна, Пашканесаў з вёскі Белева Аршанскага раёна, Пытлякоў з вёскі Халоп'е Івацэвіцкага раёна, Сагайдаравых з Жодзіна, Такмаковых з Рэчыцы і Церахавых з вёскі Копці Віцебскага раёна.

Жывуць і выхоўваюцца у гэтых вялікіх і дружных сем'ях 43 родных і 113 прыёмных дзяцей. Стварылі міласэрныя сем'і рабочыя, калгаснікі, служачыя, настаўнікі, ваеннаслужачыя, выхавацелі. Узрост бацькоў-выхавацеляў дзесьці ад 33 да 43 гадоў, але сустракаюцца маладзейшыя за 30 і старэйшыя за 45 гадоў.

Прыёмныя дзеці таксама ў розным узросце: ад немаўлят да 16-гадовых юнакоў і дзяўчат, але большасць — двух-васьмігадовыя. Вопыт сведчыць, што "дашкольнікі ці малодшыя школьнікі хутчэй і лепш прывыкаюць да новай сям'і і лягчэй выхоўваюцца". Так было напісана у адной анкеце, якую мы распаўсюджвалі сярод бацькоў-выхавацеляў.

Аднак не трэба думаць, што бацькі-выхавацелі цураюцца цяжкасцей: яны бяруць на выхаванне фізічна слабых, хворых, з затрымкамі ў псіхічным развіцці дзяцей. Адна маці з усмешкай успаміпала, як дзівіліся на яе супрацоўнікі школы-інтэрната, а потым з палёгкай уздыхнулі, калі яна ўзяла самага "шкадлівага", жвавага, як ртуць, хлапчука. Тым больш, што дырэктар яе не ашукала, як гэта бывае, не хавала медыцынскіх дакументаў са складаным дыягназам: гіпердынамічны сіндром (тое, што у народзе завецца "на ім скура гарыць") з элементамі дэбілізму. Сапраўды, першы час маці не была ўпэўнена, што здолее даць рады хлопчыку, але праз месяц-другі з'явіліся поспехі, а з імі і надзея.

Увогуле трэба адзначыць, што дзеці даволі хутка прывыкаюць да новых абставін. У адных, як сведчыць анкетаванне, адаптацыйны перыяд займаў усяго некалькі дзён, у другіх — месяц-паўтара, у часткі — да паўгода і толькі адзінкі, сталейшыя, прывыкалі каля года.

У большасці сем'яў прыёмныя і родныя дзеці амаль адразу ўступалі ў зносіны, прывыкалі адно да аднаго, станавіліся братамі і сёстрамі. Вось прыклад. У адной сям'і, якая папоўнілася дзецьмі з дзіцячага дома, 5-гадовая дзяўчынка першыя дні пыталася ў бацькоў: "Калі вы адвязеце іх назад?" А пасля некалькіх тыдняў на наша пытанне: "Можна, мы забярэм у вас гэтых дзяцей?" адказала, абняўшы сваю новую сяс-

трычку: "Не, не аддам, не трэба, я іх люблю!". Безумоуна, не усё бывае ціха і гладка, здараюцца эксцэсы, але гэта звычайна па-дзіцячы хутка праходзіць і забываецца.

Ёсць і незвычайныя праблемы, з якімі не сутыкаюцца бацькі пры выхаванні толькі родных дзяцей. Напрыклад, "дзетдомаускія" не ведаюць мноства рэчау, знаёмых нават маленькім: не лічаць хлебам бохан (бо бачылі хлеб толькі лустамі), блытаюць бульбу з каменнямі, страшэнна баяцца кошак і сабак, не разумеюць, чаму чай у шклянцы адразу не салодкі, у свае 8-12 гадоў не ўмеюць карыстацца газам, рыхтаваць ежу, падшываць каунерыкі да школьнай формы, даглядаць хатнюю жывёлу і г.д. Яны маюць шкодныя звычкі: ужываюць жаргонныя словы, хлусяць, па-варварску абыходзяцца з адзеннем і абуткам і ўвогуле з рэчамі, крадуць, асабліва хлеб, масла, каўбасу, якія хаваюць у ложак ці ў адзенне.

Шмат намаганняу даводзіцца прыкладаць бацькам-выхавацелям, каб дапамагчы дзецям асвоіцца у новым асяроддзі. І калі хатнія рэчы даволі хутка становяцца ім добра знаёмымі, то пазбавіцца ад дрэнных звычак значна цяжэй. Галоуны памочнік у гэтым — любоу і пяшчота. Часцей за ўсё дзеці баяцца засмуціць сваю адшуканую "мамачку" (гэтае слова мае для іх велізарную каштоунасць і злятае з вуснау кожную хвілінку), таму дужа стараюцца сачыць за сваімі паводзінамі. Але так не заўсёды атрымліваецца: то рукі самі пацягнуцца у чужую кішэню, то язык схлусіць, то ногі завядуць не ў тое месца, куды трэба. І тады зноў пачынаюцца размовы, зноў абяцанні, зноу пошукі шляхоў да дзіцячай душы і розуму. Цяжка сказаць, што спачатку часцей сустракаецца ў гэтай бясконцай працы бацькоў — поспехі ці расчараванні, але пакуль ніхто з беларускіх бацькоу-выхавацеляў не сышоу з абранага шляху. Увогуле, з больш чым чатырохсот дзіцячых дамоу сямейнага тыпу (дакладную лічбу назваць немагчыма, бо новыя з'яуляюцца пастаянна), якія адкрыты у былым Савецкім Саюзе, распалася толькі 8. Значыць, жыццё у іх будзе доугае, на карысць дзецям і грамадству.

Калі наша група пачала займацца дадзенай праблематыкай, то нас, натуральна, цікавіла пытанне аб матывах дзейнасці бацькоу-выхавацеляу. Адказы у анкетах не былі нечаканымі. Гучалі яны так: "Жаданне вярнуць дзецям страчаную сямейную цеплыню, ласку, любоў і клопат маці і бацькі", "Імкненне дапамагчы найбольш абяздоленым і хворым дзецям" і нават "Магчымасць дапамагчы рэспубліцы у вырашэнні праблемы сіроцтва". Гэтыя адказы амаль нічога не прыбавілі да партрэта прыёмных бацькоу як людзей добрых і клапатлівых. А вось сустрэчы, размовы, назіранні за дарослымі і дзецьмі адкрылі вочы на тое, што натуральна для адных і нават цяжка уявіць другім.

Справа ў тым, што, апрача таленту мастака, пісьменніка, музыканта, увогуле артыста, існуе талент Педагога, Выхавацеля, сэрца якога прасякнута вялікім пачуццём любві да дзяцей і адказнасцю за бездапаможных. "Я адказваю за ўсё" і "Калі не я, то хто?" — вось дэвіз, які вядзе бацькоў-выхавацеляу па жыцці. Не, самі яны ніколі не кажуць высокіх слоу, але трэба бачыць, як гэтыя людзі адносяцца да дзяцей, распавядаюць пра іх. Тэма дзіцячага жыцця для іх невычэрпная, падрабязнасцей аб маленькіх, але ўпаўнаважаных членах сям'і — бездань. І вось ідзе гадзіна, другая, трэцяя... шостая, а бацькам ёсць што казаць, калі ў вас ёсць жаданне слухаць. А побач мітусяцца тыя, аб кім ідзе гаворка, то запаузуць на калені да бацькі, то прытуляцца да маці, і па усяму бачна, што яны тут галоўныя і жаданыя.

На першы погляд, бацькі-выхавацелі — звычайныя людзі. Яны не кідаюцца ў вочы на вуліцы, не адметныя ў чэргах. Незвычайныя ў іх душы. Уявіце толькі: у цяперашні цяжкі час, калі не ведаеш, як утрымаць сваіх дзяцей (часцей нават свайго аднаго), сустракаюцца дзівакі, якія маюць патрэбу даглядаць і абаграваць чужых. Хоць такімі іх не лічаць. "Чужога гора не бывае" — гэта таксама пра бацькоў-выхавацеляў.

Толькі не трэба думаць аб іх карыслівасці, бо аніякага прыбытку ўтрыманне дзіцячага дома сямейнага тыпу не дае. Ды бацькі-выхавацелі і не спадзяюцца на гэта. Усё, што ім патрэбна, — жыллё і справа. Часцей за усё — кавалак зямлі, дзе можна зрабіць грады, пасадзіць бульбу, выпасваць карову або гадаваць іншую хатнюю жывёлу. Ну і трохі грошай на самае неабходнае: хлеб, адзенне, абутак, школьныя прылады. На астатняе яны заробяць разам з дзецьмі, бо лічаць неабходным далучаць да працы з маленства.

Жыллё, зямлю і грашовую дапамогу бацькі-выхавацелі спадзяюцца атрымаць ад дзяржавы. Не трэба забываць, што ўтрыманне аднаго дзіцяці ў інтэрнаце абыходзіцца дзяржаве амаль у 50 тысяч рублёў, а дапамога на догляд у сямейным дзіцячым доме — у 4-5 разоў менш. Вынікі ж выхавання ў шмат



разоу лепшыя. Відавочная карысць і дзяржаве, і дзецям, і нам з вамі, бо пасля інтэрнатаў мноства іх выхаванцау аказваюцца у турмах і калоніях. Таму ад нас, тых, хто жывуць побач з незвычайнымі сем'ямі альбо сутыкаюцца з бацькамі-выхавацелямі па справах, у чэргах магазінаў, гарадскім транспарце, бальніцы, — яны чакаюць калі не падтрымкі і разумення, то хаця б адсутнасці варожасці. Менавіта на недобразычлівыя адносіны

